# Неразвітыя і развітыя сказы (5 клас)

**Н. А. Сакалова,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 18 г. Пінска

**Мэта:** знаёмства пабудовай простага неразвітага і развітага сказаў.

**Задачы:** выпрацоўваць уменні адрозніваць такія сказы ў тэкстах, дапаўняць неразвітыя скаы даданымі членамі; выяўляць ролю неразвітых сказаў і развітых у маўленні; развіваць граматычны лад маўлення; ужываць неразвітыя і развітыя сказы ва ўласным маўленні; садзейнічаць выхаванню цікавасці да роднай мовы.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Абсталяванне:** падручнікі, карткі з заданнямі.

## Ход урока

**І. Арганізацыйны момант.**

Псіхалагічны настрой. Прыём “Ланцужок дабра”.

**ІІ. Актуалізацыя ведаў.**

Франтальнае апытванне.

- Нагадайце, які раздзел мы вывучаем?
- Якую сінтаксічную адзінку мы вывучаем?
- Што такое сказ?
- Якія сказы бываюць па мэце выказвання і па інтанацыі?
- Што такое граматычная аснова сказа?
- Якія вы ведаеце даданыя члены сказа?

**ІІІ. Паведамленне тэмы і мэты.**

**ІV. Тлумачэнне новага матэрыялу.**

На дошцы запісаны сказы: Лятаюць ластаўкі. Высока ў небе лятаюць прыгожыя ластаўкі.

- Параўнайце сказы. Як вы думаеце, які сказ больш поўна характарызуе прадметы, з’явы?
- А цяпер разбярыце сказы па членах. ( Вучань ля дошкі, усе ў сшытках.)
- Хто? Ластаўкі. Ластаўкі што робяць? Лятаюць.
- І што тут мы бачым? ( Першы сказ складаецца толькі з граматычнай асновы.)
- У другім сказе граматычная аснова ластаўкі лятаюць. А далей? Ластаўкі якія? Прыгожыя. Гэта азначэнне.Лятаюць дзе? У небе. Гэта акалічнасць. Лятаюць як? Высока. Таксама акалічнасць.
- І што мы тут бачым? (Другі сказ, акрамя граматычнай асновы, мае даданыя члены сказа.)

- Як вы думаеце: які сказ будзе развітым, а які неразвітым? Чаму?
- Які можам зрабіць вывад? (Адказы вучняў.)
- Малайцы! Але можа мы з вамі нешта не агучылі? Што не сказалі?

1. Работа з падручнікам. Чытанне і агучванне правіла. (У парах.)

- Што не сказалі? (Адказы вучняў.)
- Якія сказы называюцца развітымі? Неразвітымі? Прывядзіце прыклады.
- Якія сказы больш маляўніча і вобразна апісваюць з'явы, прадметы? (Развітыя.) Таму пры маўленні мы выкарыстоўваем развітыя сказы.
- Падыміце рукі тыя, хто з вас можа вызначыць развіты сказ ці неразвіты. Тады прапаную вам заданне.

2. Заданне 1. ( На картках). Прачытаць сказы, вызначыць развіты сказ ці неразвіты. Даказаць. (Вучні выконваюць заданне вусна, па ланцужку.)

Стаяць сосны. Стаяць абапал стройныя сосны. Раніца. Імжыць дождж. Зіхацяць зоркі. На траве зіхацяць кропелькі расы. Зялёны бор шуміць над галавой. Лёгкія хмурынкі плывуць па небе. Развіднела. Надышла зіма.

- З якой мэтай выканалі заданне?
- Дык якія сказы называюцца неразвітымі? Развітымі?

3. Запісаць сказы, падкрэсліць граматычныя асновы, дададаныя члены. Вызначыць: развіты сказ ці неразвіты. (Вучань ля дошкі, усе ў сшытках.)

Надышла зіма. Надышла халодная зіма.

4. "Выберы патрэбны сказ". Я чытаю сказы, а вы уважліва слухаеце, выбіраеце і запісваеце нумары: І варыянт – неразвітых сказаў, ІІ варыянт – развітых сказаў.

( 1. На замлю сыпле белы снег. 2. Сыпле снег. 3. Скачуць спрытныя вавёркі. 4. Раскінуўся лес. 5. Раніца. 6. Узняўся моцны вецер. 7. Узняўся вецер. 8. Закіпела дружная праца. 9. Дыхаў ветрык. 10. Ярка свяціла сонца.)

(Самаправерка. І варыянт – 2, 4, 5, 7, 9. ІІ варыянт – 1, 3, 6, 8, 10)

- У каго усё правільна? У каго былі памылкі?

5.Фізкультхвілінка.

- Я называю сказы. Калі сказ неразвіты – вы пляскаеце ў далоні, а калі развіты – вы прысядаеце.

( Насоўвалася хмара. Хутка пацямнела неба. Бліснула маланка. Вечарэе. Заціх стары неўгамонны лес. Хлынуў дождж. Ён забарабаніў буйнымі кроплямі. Пачалася навальніца.)

- Малайцы! Крыху адпачылі, сядайце калі ласка.

6. "Упрыгожце сказ" Заданне 2 (на картках). З неразвітых сказаў утварыць і запісаць развітыя: І варыянт – Узыходзіць сонца.
ІІ варыянт – Раса зіхаціць.
ІІІ варыянт – Туман сцелецца.

Словы для даведкі: раніцай, над лесам; халодная, на галінках дрэў; густы, уздоўж ракі;

7. Праца з тэкстам. Заданне 3 (на картках).

(Раніца. Да сонца яшчэ больш як гадзіна. На ўсходзе няма ні хмурынкі. Неба праясняецца. Віднеецца белая пляма світання. Лагодны ветрык калыша зялёную лістоту на дрэвах. Птушкі пераклікаюцца паміж сабой. Дзень прачынаецца.)

- Давайце ўспомнім, што такое тэкст?
- Прачытайце. Перад намі тэкст? Дакажыце.
- Вызначце тэму, асноўную думку, стыль, тып.
- Прыдумайце загаловак.
- Знайдзіце ў тэксце і назавіце неразвітыя сказы. Дакажыце, што астатнія сказы развітыя.
- Выканаць наступныя заданні: на “ 3-4” – выпісаць неразвітыя сказы, падкрэсліць граматычныя асновы; на “ 5-6” – выпісаць развітыя сказы, разабраць па членах; на “7-8” – перабудаваць неразвітыя сказы ў развітыя і запісаць, падкрэсліць галоўныя і даданыя члены; на “9-10” – прыдумаць і запісаць працяг тэксту (5–6 сказаў), ужываючы як развітыя, так і неразвітыя сказы. (5 хв.) (Адказы вучняў.)

**V. Падагульненне.**

- Скажыце, якія сказы вам прыйдуць на дапамогу, каб выказаць дакладную, грунтоўную думку? (Развітыя)
- Па якой прымеце іх можна распазнаць?

**VI. Рэфлексія. Метад “ Закончы фразу”.**

- Я даведаўся …
- Мне лёгка было …
- Мне было цяжка …

**VII. Ацэнка дзейнасці вучняў на ўроку.** Выстаўленне і каментарый адзнак.

VIII. Дамашняе заданне: & 24, практыкаванне 175.

**Дзеяслоў як часціна мовы: агульнае значэнне, іарфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс не (ня) з дзеясловамі**

**VII клас**

Мэта: паўтарэнне, паглыбленне і сістэматызацыя ведаў вучняў пра дзеяслоў як пра часціну мовы.

Задачы: выпрацоўваць уменне фармуляваць азначэнне дзеяслова; распазнаваць дзеясловы ў сказах, тэкстах, адрозніваць іх ад іншых часцін мовы; вызначаць зменныя марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю; спрыяць засваенню вучнямі правапісу не (ня) з дзеясловамі; ужываць дзеясловы ў вусным і пісьмовым маўленні; садзейнічаць выхаванню цікавасці і любові да роднай мовы.

Тып урока: камбінаваны.

Абсталяванне: падручнікі, карткі з заданнямі.

Ход урока

I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Псіхалагічны настрой. Прыём “ Ланцужок дабра”.

II. Праверка дамашняга задання. Практыкаванне 39. Прыём “ Экспертыза”.

III. Падрыхтоўка да ўспрымання новай тэмы.

- Паслухайце верш і паспрабуйце здагадацца, аб чым пойдзе сёння наша размова?

Папрасіць і загадаць магу,
Вызначыць вам час дапамагу.
А калі з займеннікам стаю,
Дык асобу лёгка пазнаю.
Пачынайце дзейнічаць – і зноў
Вам дапаможа сябар …      (дзеяслоў).

IV. Паведамленне тэмы і мэты ўрока.

Вучні самастойна фармулююць тэму і мэту ўрока. Я ўдакладняю.

V. Тлумачэнне новага матэрыялу.

1. Вучні выконваюць практыкаванне 40 з мэтай: прачытаць верш, уставіць прапушчаныя словы-назвы месяцаў; знаходзяць словы, якія абазначаюць дзеянне.

- На якія пытанні адказваюць гэтыя словы? Да якой часціны мовы яны адносяцца? Які можам зрабіць вывад?    (адказы вучняў).

2. Работа з падручнікам над тэарэтычным матэрыялам. Чытанне і агучванне правіла.          (праца ў парах).

VI. Праверка разумення вучнямі новага матэрыялу.

1. “ Лінгвістычная эстафета”  (у групах).

На дошцы для кожнай каманды напісаны дзеясловы. Вучні кожнай групы па чарзе, перадаючы адзін аднаму крэйду, вызначаюць марфалагічныя прыметы. Перамагае тая каманда, якая правільна і хутка выканала заданне.

2. Вучань ля дошкі, а ўсе астатнія ў сшытках выконваюць заданне. Пад дыктоўку запісваюць сказы, знаходзяць дзеясловы і вызначаюць, што яны абазначаюць, вызначаюць марфалагічныя прыметы і сінтаксічную ролю ў сказе.

3. Аналагічнае заданне вучні самастойна выконваюць па варыянтах. (Самаправерка).

- У каго не было памылак? Скажыце,а што абазначаюць дзеясловы ў запісаных вамі сказах? Якое дзеянне? (Рух, стан чалавека ці прыроды, перамяшчэнне ў прасторы і г.д.).

Робіцца вывад: акрамя таго, што дзеяслоў абазначае дзеянне, ён абазначае яшчэ рух, стан, фізічныя дзеянні, перамяшчэнне ў прасторы, разумовую дзейнасць. (Пывесці прыклады).

4. Фізкультхвілінка

- Я называю словы, якія адносяцца да розных часцін мовы. Калі гэта дзеяслоў – вы пляскаеце ў далоні, калі іншая часціна мовы – прысядаеце.  (Нездаровіцца, радасць, не чытае, бульба, не ведае, моцны, недаядаць, дождж, няможацца, не возьмеш, цёплы, не забыць, не падняцца ).

- Скажыце, што вы заўважылі падчас фізкультхвілінкі? Якія дзеясловы нам сустрэліся? (Дзеясловы з НЕ ).

- А як пішацца не з дзеясловамі? (Асобна).

- Нам сустрэлмся яшчэ дзеясловы з прыстаўкай НЕДА, з НЯ. Як мы іх правільна напішам? Чаму? Каб адказаць на гэтае пытанне, звернемся да падручніка.

5. Работа з падручнікам. Чытанне і агучванне правіла. (с. 32-33).

6. Практыкаванне 47. Выконваем з мэтай : размеркаваць словазлучэнні на групы ў залежнасці ад таго, як пішацца НЕ з дзеясловамі, растлумачыць правапіс.

Прыём “ Рэшата”.

7. Практыкаванне 46. (Пісьмова, самастойна, па варыянтах).

8. Праца з тэкстам.

- Што такое тэкст? Прачытайце. Дакажыце, што гэта тэкст. Вызначце тэму, асноўную думку, тып і стыль. Прыдумайце загаловак.

(У лесе стаіць змрок. Пахне смалой і вільготным лісцем. Толькі лясны ручай булькоча. Ён то схаваецца ў кустах, то абміне тоўстую сасну і забурліць сярдзіта. Сосны і елкі маўчаць у задуменні, нібы аб нечым разважаюць. Дрэмлюць моцныя дубы. Трапяткія асіны ніколі не ведаюць спакою.)

- Выканаць заданні: на “3-4” – знайсці і выпісаць дзеясловы; на “5-6” – вызначыць, што абазначаюць гэтыя дзеясловы; на “7-8” – вызначыць марфалагічныя прыметы і сінтаксічную ролю ў сказе; на “9-10” - прыдумаць і запісаць працяг тэксту ( 5-6 сказаў), ужываючы дзеясловы.

VII. Кантрольна – ацэначны этап

1. Выканаць тэставае заданне

1.Выбраць сярод прыкладаў дзеясloў:

а) дом; б) спаць; в) весялосць; г) хтосьці; д) адпачываць.

2. Адзначце граматычныя катэгорыі, не ўласцівыя дзеяслову:

а) час; б) склон; в) лік; г) адушаўлёнасць – неадушаўлёнасць; д) асоба.

3. У сказе дзеяслоў звычайна бывае:

а) дзейнікам; б) выказнікам; в) дапаўненнем; г) азначэннем; д) акалічнасцю.

4. Колькі дзеясловаў ужыта ў сказе? Адказ запішыце лічбай.

Мяч моцна ўрэзаўся ў крыжавіну варот, падскочыў пару разоў і паволі пакаціўся насустрач.

а) 2; б) 4; в) 3; г) 1; д) 5.

5. Адзначце сказы, у якіх -не- з дзеясловамі пішацца асобна:

а) Ніхто (не) любіў так бор з яго ваколіцамі, як Алёшка.

б) Думка пра дубок (не) пакоіла Рыгора ўвесь вечар.

в) Сам (не) умееш слухаць – другога (не) прымусіш.

г) Дзед крыху (не) дачуваў, крыху (не) дабачваў.

(узаемаправерка)

VIII. Падагульненне

Калектыўная праца. Прыём “Дапоўні сказ”

А) Дзеяслоў – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае …

Б) Дзеясловы змяняюцца па …

В) У сказе дзеяслоў звычайна бывае …

Г) НЕ з дзеясловамі пішацца …

Д) Не (ня) з дзеясловамі пішацца разам, калі …

IX. Рэфлексія. Метад “Закончы фразу”

- Сёння я даведаўся (лася) …
- Я зразумеў (ла) …
- Было цяжка …
- Было лёгка …

X. Ацэнка дзейнасці вучняў на ўроку. Выстаўленне і каментарый адзнак.

XI. Тлумачэнне выканання дамашняга задання & 7-8, пр. 44